*УДК 811.161.3‘42‘367.4‘373:159.952:398.92:821.161.3-1/-7*Я.Купала*
**В. В. Напрэенка**
***Навук. кір. – З. У. Шведава, канд. філал. навук, дацэнт***

# ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ МОВЫ ТВОРАЎ ЯНКІ КУПАЛЫ З КАМПАНЕНТАМ *ВОЧЫ*: СТРУКТУРА СЛОВАЗЛУЧЭННЯ

*У артыкуле разглядаюцца фразеалагічныя адзінкі з кампанентам вочы, выяўленыя ў мове твораў Янкі Купалы. Асноўная ўвага засяроджваецца на адзінках, якія по сваёй структуры суадносяцца са словазлучэннем. Сярод такіх фразеалагічных выразаў*

*часцей сустракаюцца дзеяслоўныя словазлучэнні. Таксама адзначаюцца фразеалагізмы са структурай назоўнікавага, прыметнікавага і прыслоўнага словазлучэнняў.*

Самай шматлікай структурна-граматычнай разнавіднасцю фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы з кампанентам *вочы* з‘яўляюцца фразеалагічныя адзінкі, якія па сваёй структуры суадносяцца са словазлучэннем (100 адзінак).

Неабходна адзначыць, што паміж кампанентамі ў фразеалагізмахсловазлучэннях назіраюцца толькі два віды сувязі: дапасаванне
(*сваімі вачыма* [1, с. 33], *вока благое* [1, с. 40], *вока нелюдское* [1, с. 41], *пражорлівае вока* [1, с. 41] і інш.) і кіраванне (*вадзіць вачамі* [1, с. 31], *віднець вачамі* [1, с. 31], *не зводзіць вачэй* [1, с. 33], *паміж вачэй закласці* [1, с. 33] і інш.).

Сярод фразеалагізмаў, суадносных са структурай словазлучэння найбольш пашыраным тыпам (90 адзінак) выступаюць фразеалагізмы, структурна арганізаваныя як дзеяслоўныя словазлучэнні, напрыклад: *мець вока* [1, с. 40], *не весяліць вока* [1, с. 41], *не зводзіць вока* [1, с. 41], *не спускаць вока* [1, с. 41], *сысці з вока* [1, с. 42], *вокам абвесці* [1, с. 42] і інш. Заўважым, што большасць з іх паводле катэгарыяльнага значэння належыць да дзеяслоўных фразеалагізмаў: *вокам зазіраць* _цікавіцца, праяўляць цікавасць, інтарэс да чаго-, кагон‘ [1, с. 43], *вокам міргнуць* _даць знак аб сваёй прыхільнасці, увазе‘ [1, с. 43], *вокам нельга прабіць* _нічога не відаць‘ [1, с. 43] і інш.

Два фразеалагізмы, структурна арганізаваныя як дзеяслоўнае словазлучэнне, нельга суаднесці з часцінамі мовы (*у вачах мігае* _хтон. адчувае стракатасць, міргане кропак перад вачыма‘ [1, с. 32], *патупіць вочы* _хто-н. збянтэжыўся, устрывожыўся, знерваваўшыся‘

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

[1, с. 56]).
Прааналізаваўшы структуру дзеяслоўных словазлучэнняў можна зрабіць выснову, што двухкампанентныя выразы пераважаюць. Сярод іх самую прадуктыўную мадэль складаюць фразеалагізмы, утвораныя па структурнай схеме «дзеяслоў + назоўнік у вінавальным склоне» (21 адзінка): *вабіць вока* [1, с. 40], *мець вока* [1, с. 40], *адплюшчваць вочы* [1, с. 49], *выдзіраць вочы* [1, с. 52], *вытрашчыць вочы* [1, с. 53], *дзерці вочы* [1, с. 53], *заліць вочы* [1, с. 53], *зацямніць вочы* [1, с. 53], *заліць вочы* [1, с. 53], *зацямніць вочы* [1, с. 53], *зачыніць вочы* [1, с. 54], *звярнуць вочы* [1, с. 54], *згубіць вочы* [1, с. 54], *кіраваць вочы* [1, с. 54], *круціць вочы* [1, с. 54], *заплюшчыць вочы* [1, с. 55], *падняць вочы* [1, с. 55], *патупіць вочы* [1, с. 56], *працерці (праціраць) вочы* [1, с. 56], *сляпіць вочы* [1, с. 57], *утаропіць вочы* [1, с. 58].

Прадуктыўнай выступае і такая мадэль як «назоўнік у вінавальным склоне + дзеяслоў» (15 адзінак): *вочкі спусціць* [1, с. 49], *вочы адкрыць* [1, с. 49], *вочы асляпіць* [1, с. 49], *вочы вадзіць* [1, с. 50], *вочы выбраць* [1, с. 50], *вочы жмурыць* [1, с. 50], *вочы заплюшчыць* [1, с. 55], *вочы запляваць* [1, с. 50], *вочы калоць*[1, с. 50], *вочы лупіць* [1, с. 51], *вочы навесці* [1, с. 51], *вочы расіць* [1, с. 52], *вочы сплюшчыць* [1, с. 52], *вочы спусціць* [1, с. 52], *вочы ўтаропіць* [1, с. 52].
Заўважым, што такія фразеалагічныя адзінкі як *вочы ўставіць* [1, с. 52], *зачыніць вочы* [1, с. 54] могуць ужывацца з інверсійным парадкам слоў і ўключацца ў іншую структурную схему: «назоўнік у вінавальным склоне + дзеяслоў» (*вочы ўставіць* [1, с. 52] і *вочы зачыніць* [1, с. 54]) або «дзеяслоў + назоўнік у вінавальным склоне» (*уставіць вочы* [1, с. 52] і *зачыніць вочы*[1, с. 54]).
Менш пашырана мадэль, пры якой залежны кампанент-назоўнік стаіць у творным склоне (12 адзінак): *вадзіць вачамі* [1, с. 31], *віднець вачамі* [1, с. 31], *забегаць вачыма* [1, с. 33], *кінуць вачыма* [1, с. 33], *лыпнуць вачыма* [1, с. 33], *пабегаць вачыма* [1, с. 33], *свяціць вачыма* [1, с. 33], *глянуць вокам* [1, с. 43], *зірнуць вокам* [1, с. 43], *назіраць вокам* [1, с. 44], *сачыць вокам* [1, с. 44], *стрэліць вочкам* [1, с. 49].
Прадуктыўнай можна лічыць і наступную структурную схему: «назоўнік у творным склоне + дзеяслоў» (7 адзінак): *вачыма абводзіць* [1, с. 32], *вачыма міргаць* [1, с. 32], *вокам абвесці* [1, с. 42], *вокам абмінаць* [1, с. 42], *вокам зазіраць* [1, с. 43], *вокам міргнуць* [1, с. 43], *вокам сягнуць* [1, с. 43].
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адзначым, што некаторыя фразеалагізмы (3 адзінкі) могуць ужывацца з іншым парадкам слоў, у сувязі з чым зменьваецца іх структурная схема. Так, напрыклад, фразеалагізм *вачыма вадзіць* [1, с. 32] адпавядае схеме «назоўнік у творным склоне + дзеяслоў», аднак ѐн можа ўжывацца і ў адваротным парадку слоў *вадзіць вачыма* [1, с. 32] і ў такім выпадку структурная схема будзе наступнай «дзеяслоў + назоўнік у творным склоне». Тое ж можна сказаць і пра такія фразеалагізмы як *вокам акінуць (кінуць)* і *акінуць (кінуць) вокам* [1, с. 42]*, вочкам кінуць* і *кінуць вочкам* [1, с. 48].

Сярод двухкампанентных малапрадуктыўнымі з‘яўляюцца наступныя мадэлі:

«дзеяслоў + назоўніку родным склоне»: *мазоліць воч* [1, с. 48];

«дзеяслоў + назоўнік у давальным склоне»: *паддацца вочам* [1, с. 48].

Розныя мадэлі ўтвараюць фразеалагізмы, усе тры кампаненты якіх генетычна паўназначныя словы (7 адзінак).Так, у спалучэнне з дзеясловам могуць уступаць атрыбутыўныя канструкцыі (*агледзець вокам пільным* [1, с. 42], *азірнуцца ясным вокам* [1, с. 42], *косым*



*вокам пазіраць* [1, с. 43], *крытычным вокам аглядаць* [1, с. 44], *мілым вокам паглядаць* [1, с. 44], *пазіраць сумным вокам* [1, с. 44], *сачыць вокам ласым* [1, с. 44]).

Часта трохкампанентныя фразеалагізмы ўтвараюцца па тых жа мадэлях, што і двухкампанентныя з дабаўленнем адмоўнай часціцы *не* перад дзеяслоўным кампанентам *не зводзіць вачэй* [1, с. 33], *воч не спускаць* [1, с. 48], *вочкам не міргнуць* [1, с. 49], *не весяліць вока* [1, с. 41], *не зводзіць вока* [1, с. 41], *не спускаць вока* [1, с. 41], *вочы не гнявіць* [1, с. 51].

Структурная схема «дзеяслоў + назоўнік у вінавальным склоне з прыназоўнікам» налічвае 4 адзінкі: *упасці ў вока* [1, с. 42], *біць у вочы* [1, с. 49], *плюнуць у вочы* [1, с. 56], *лезці ў вочы* [1, с. 55].

Сярод фразеалагізмаў з кампанентам *вочы* сустракаецца і такая мадэль як «дзеяслоў + назоўнік у родным склоне з прыназоўнікам»: *спусціць з вока* [1, с. 42], *сысці з вока* [1, с. 42].

Трохкампанентныя фразеалагізмы са структурай дзеяслоўнага словазлучэння ўтвараюць наступныя малапрадуктыўныя мадэлі:

«прыназоўнік + назоўнік у творным склоне + дзеяслоў»: *перад вачамі стаяць* [1, с. 31];

«назоўнік у месным склоне з прыназоўнікам + дзеяслоў»: *у вачах*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*мігае* [1, с. 32];
«прыназоўнік + назоўнік у родным склоне + дзеяслоў»: *паміж вачэй закласці* [1, с. 33];
«назоўнік у вінавальным склоне з прыназоўнікам + дзеяслоў» (*на вока выкідаць* [1, с. 41];
«назоўнік + безасабова-прэдыкатыўнае слова + дзеяслоў» (*вокам нельга прабіць* [1, с. 43].
Фразеалагізм *мець на воку* і *на воку мець* [1, с. 45] не мае фіксаванага парадку слоў, таму мадэль утварэння можна прадставіць у наступным выглядзе: «дзеяслоў + назоўнік у месным склоне з прыназоўнікам» і «назоўнік у месным склоне з прыназоўнікам + дзеяслоў».
Чатырохкампанентныя фразеалагізмы маюць разнастайныя структурныя схемы: *праўдзе ў вочы глянуць* [1, с. 56], *смерці ў вочы глядзець* і *смерці глядзець у вочы* [1, с. 57].
Другі тып складаюць фразеалагізмы са структурай назоўнікавага словазлучэння (8 адзінак): *з адкрытымі вачыма* [1, с. 33], *сваімі вачыма* [1, с. 33], *вока благое* [1, с. 40], *вока нялюдское* [1, с. 41], *пражорлівае вока* [1, с. 41], *вочы крывёй наліты* [1, с. 50], *вочы пад лоб* [1, с. 51], *на свае вочы* [1, с. 55].

З дадзеных фразеалагізмаў два паводле свайго катэгарыяльнага значэння суадносяцца з назоўнікам (*вока благое* [1, с. 40], *вока нелюдское* [1, с. 41]), тры – з прыслоўем (*з адкрытымі вачыма* [1, с. 33], *сваімі вачыма* [1, с. 33], *на свае вочы* [1, с. 55]), адзін – з прыметнікам (*пражорлівае вока* [1, с. 41]) і дзве фразеалагічныя адзінкі нельга суаднесці з той ці іншай часцінай мовы (*вочы крывёй наліты* [1, с. 50], *вочы пад лоб* [1, с. 51]).
Для дадзенага структурнага тыпу характэрны двух- і трохкампанентныя фразеалагізмы.
Двухкампанентныя фразеалагізмы: *вока благое* [1, с. 40], *вока нелюдское* [1, с. 41], *пражорлівае вока* [1, с. 41] утварыліся па мадэлі «назоўнік у назоўным склоне + атрыбутыўнае слова (прыметнік)».
І. Я. Лепешаў адзначае, што «звычайна ў выразах гэтай мадэлі, як і ў некаторых іншых падобных мадэлях, атрыбутыўнае слова, залежнае ад граматычна галоўнага кампанента-назоўніка, знаходзіцца ў прэпазіцыйным становішчы» [1, с. 125]. Дадзенае палажэнне добра ілюструюць прыклады, прыведзеныя вышэй.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Структурная схема фразеалагізма *сваімі вачыма* [1, с. 33] адрозніваецца ад папярэдняй тым, што тут з атрыбутыўным словам (займеннікам) спалучаецца назоўнік у форме творнага склону.
Трохкампанентныя фразеалагізмы прадстаўлены трыма мадэлямі: «прыназоўнік + атрыбутыўнае слова + назоўнік» (*з адкрытымі вачыма* [1, с. 33], *на свае вочы* [1, с. 55]), «назоўнік у назоўным склоне + прыназоўнік + назоўнік у назоўным склоне» (*вочы пад лоб* [1, с. 51]), «назоўнік у назоўным склоне + назоўнік у творным склоне + дзеепрыметнік» (*вочы крывёй наліты* [1, с. 50]).
Трэці тып – фразеалагічныя адзінкі са структурай прыметнікавага спалучэння. Сюды ўваходзіць толькі адзін фразеалагізм з кампанентам *вочы*: *воку мілы* [1, с. 45], у якім граматычна галоўным выступае прыметнікавы кампанент. Фразеалагізм *воку мілы* [1, с. 45] мае двухкампанентную мадэль, у якой прыметнікавы кампанент кіруе назоўнікам у родным склоне.
Чацвёрты тып – фразеалагізмы са структурай прыслоўнага словазлучэння. Заўважым, што сюды ўваходзяць і выразы з дзеепрыслоўным кампанентам як апорным словам. Сярод фразеалагізмаў
з кампанентам *вочы* да прыслоўных адносіцца *не маргнуўшы вокам* [1, с. 44], які ўтвораны па схеме «часціца не + дзеепрыслоўе + назоўнік у творным склоне».
Такім чынам, можна зрабіць выснову, што большасць фразеалагізмаў з кампанентам *вочы* па структуры суадносіцца са словазлучэннем (100 адзінак). Найбольш шматлікім тыпам сярод фразеалагізмаў са

структурай словазлучэння (90 адзінак) з‘яўляюцца фразеалагічныя адзінкі, структурна арганізаваныя як дзеяслоўныя словазлучэнні. Фразеалагізмы са структурай назоўнікавага словазлучэння налічваюць 8 адзінак, прыметнікавага – 1 адзінку, прыслоўнага – 1 адзінку.
**Спіс літаратуры**
1 Ляшчынская, В. А. Слоўнік фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы / В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава ; пад рэд. В. А. Ляшчынскай. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2007. – 312 с.
2 Лепешаў, І. Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1998. – 271 с.
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ